УДК 808.26-561.1

*А.А. Гапонава*

# ПРОСТЫ РАЗВІТЫ НАЗОЎНІКАВЫ ЗАГАЛОВАК ПУБЛІЦЫСТЫЧНАГА ТЭКСТУ

Простыя развітыя загалоўкі структурна разнастайныя: у іх пры галоўным слове могуць быць дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні, прыдаткі, дапаўненні і акалічнасці. Загалоўкі з дапасаванымі і недапасаванымі азначэннямі займаюць даволі значнае месца ў публіцыстыцы і шырока выкарыстоўваюцца ва ўсіх яе жанрах. Па сваёй канструкцыі такія загалоўкі нагадваюць словазлучэнне: яны маюць галоўнае і залежнае словы. Паводле выражэння галоўнага слова іх можна падзяліць на некалькі груп: назоўнікавыя, дзеяслоўныя, прыметнікавыя і інш.

У публіцыстыцы шырока выкарыстоўваюцца **назоўнікавыя загалоўкі.** Прадуктыўную групу складаюць загалоўкі, у канструкцыю якіх уваходзіць назоўнік і якасны прыметнік, які выступае ў прэпазіцыі да галоўнага слова: "Дакладны разлік" [Зв., 02.02.02]; "Дарагія пальмянцы!" [ЛіМ, 20.12.02]; "Каляровыя лекі" [НГ, 19.02.02]; "Каштоўны падарунак" [НГ, 02.03.02]; "Любімыя мелодыі" [ЛіМ, 22.11.02]; "Магутны трыпціх" [ЛіМ, 06.12.02]; "Маленькія хітрыкі" [НГ, 21.03.02]; "Малыя разбойнікі" [Зв., 20.02.02]; "Незвычайны падарунак" [НГ, 05.02.02]; "Незвычайны сад" [НГ, 12.02.02]; "Новыя лідэры" [ЛіМ, 29.11.02]; "Новыя назначэнні" [Зв., 11.01.02]; "Новая парадыгма" [П. – 1996. – № 7. – С.172]; "Паспяховае супрацоўніцтва" [ЛіМ, 11.10.02]; "Прыгожыя зубы" [Зв., 02.02.02]; "Сіні крыж" [Зв., 09.03.02]; "Старыя знаёмыя" [НГ, 01.02.02]; "Суцэльнае свінства" [Зв., 05.01.02]; "Чароўная купюра" [Зв., 14.03.02]; "Эрудзіраваныя чамучкі" [НГ, 07.03.02]. Іншы раз якасны прыметнік выступае ў форме вышэйшай ступені параўнання: "Вышэйшая ўзнагарода" [НГ, 26.03.02].

Якасныя прыметнікі ўжываюцца ў прамым і ў пераносным значэнні. Выкарыстанне якаснага прыметніка ў незвычайным для яго, пераносным значэнні дае магчымасць аўтарам заінтрыгаваць чытача, выклікаць у яго інтарэс да публікацыі. Метафарычныя загалоўкі "Мужны талент" [ЛіМ, 29.11.02]; "Усемагутны саксафон" [ЛіМ, 22.11.02]; "Шыкоўнае выступленне!" [Зв., 24.01.03] утварыліся за кошт пераносу якасцей жывых людзей на неадушаўлёныя прадметы. Незвычайнасць ужывання некаторых прыметнікаў падкрэсліваецца самімі аўтарамі, калі яны бяруць іх у двукоссе. У загалоўку "Дзікі" горад" [Зв., 19.01.02] прыметнік узяты ў двукоссе, таму што зялёныя насаджэнні ў Мінску нагадваюць некранутую 'дзікую' прыроду.

Вялікую групу ўтвараюць канструкцыі назоўніка з адносным прыметнікам. Такія канструкцыі будуюцца на падставе дапасавання, а залежны кампанент знаходзіцца ў прэпазіцыі галоўнага. Яны выражаюць азначальныя адносіны з рознымі адценнямі:

а) суб'ектным: "Аграномаўскія ядахімікаты" [Зв., 30.03.02]; "Беларуская ўпартасць" [Зв., 26.03.02]; "Выдавецкая рада" [ЛіМ, 01.11.02]; "Дзіцячыя "прыколы" [НГ, 30.03.02]; "Жаночыя хітрасці" [Зв., 19.01.02]; "Махлярскі медагляд" [Зв., 06.02.02]; "Міжнародная канферэнцыя" [НГ, 16.02.02]; "Сабачая акадэмія" [Зв., 14.01.03]; "Сваяцкае студэнцтва" [ЧЗ, 31.01.03];

б) аб'ектным: "Аліментныя пытанні" [Зв., 19.03.02]; "Выратавальная інтэграцыя" [НГ, 26.02.02]; "Выратавальны круг" [НГ, 26.02.02]; "Геаграфічны сінквейн" [НГ, 05.03.02]; "Зваротная сувязь" [Зв., 07.02.02]; "Малочны маршрут" [Зв., 21.02.02]; "Няшкодныя парады" [Зв., 21.08.03]; "Памідорныя фантазіі" [Зв., 28.08.03]; "Прадметныя гульні" [НГ, 28.02.02]; "Прыёмны экзамен" [Зв., 11.09.02]; "Прафесійная прыстойнасць" [ЛіМ, 20.12.02]; "Рытуальная карупцыя" [Зв., 26.02.02]; "Шлюбны бум" [Зв., 22.02.02];

МГПУ им. И.П. Шамякина

в) акалічнасным: “Валеўскія музыкі” [ЛіМ, 15.11.02]; “Валожынскія вундэркінды” [Зв., 22.02.02]; “Вераснёўская зорка” [Зв., 11.09.03]; “Віцебская мадонна” [П. – 1992. – №7. – С.129]; “Заслаўская трываласць” [Зв., 28.02.02]; “Іўеўскія татары” [Зв., 20.02.02]; “Калядныя фантазіі” [НГ, 12.01.02]; “Міёрскі эцюд” [Зв., 28.08.03]; “Наваполацкія метамарфозы” [НГ, 16.03.02]; “Пагранічная талака” [Зв., 14.08.03]; “Прыпяцкія вандроўкі” [М. – 1996. – №2. – С.185]; “Руская венера” [Зв., 13.03.03]; “Сталічныя гонкі” [Зв., 28.02.02]; “Сустрэчны рух” [НГ, 19.01.02]; “Французская свабода” [НГ, 07.02.02]; “Чэрвеньская капуста” [Зв., 27.02.02];

г) прыналежным: “Макавыя пакуты”[Зв.,14.08.03.]; “Народны пісьменнік” [Зв., 08.02.01].

Разам з тым, у загалоўках шырока выкарыстоўваюцца прыметнікі з якасна-адносным значэннем, што надае загалоўкам эмацыянальна-экспрэсіўнае адценне, пэўную двухсэнсоўнасць і метафарычнасць. Дадатковыя каментарыі або тлумачэнні да такіх загалоўкаў чытач можа атрымаць са зместу публікацыі. “Залаты голас”– так называецца прыз за лепшае выкананне песні [НГ, 05.03.02]; “Залатое сячэнне” – афарызм, які абазначае высокую ступень дакладнасці [ЛіМ, 22.11.02]; “Залатая шайба”– назва серыі хакейных гульняў [НГ, 19.03.02]; “Залатое яечка”– фотарэпартаж пра Беларускую занальную станцыю птушкагадоўлі [Зв., 30.01.02]. Ва ўсіх прыведзеных загалоўках прыметнік ‘залаты’ указвае на адметную якасць азначаемых назоўнікаў. “Асенняя элегія” – нарыс-успамін пра Я. Коласа, які выйшаў у друк першага лістапада і таму прасякнуты элегічнымі асеннімі матывамі [ЛіМ, 01.11.02]. “Магічнае зелле” – парады касметолага па выкарыстанні звычайных лекавых раслін [Зв., 27.08.03]; “Нецвярозы соцыум” – наркалагічныя нататкі пра гісторыі дарослых і малых алкаголікаў, якія ўтвараюць своеасаблівы соцыум і жывуць па сваіх правілах [Зв., 17.01.02].

У некаторых загалоўках гэтай групы адзін з кампанентаў узяты ў двукоссе. Такі прыём дазваляе пазбегнуць дадатковай сэнсавай нагрузкі, якая прыпадае на слова з пераносным значэннем. Двукоссе засяроджвае ўвагу чытача на нестандартным спалучэнні слоў у загалоўку. У такіх спалучэннях метафарызуюцца, як правіла, паняцці, важныя ў сацыяльных, эканамічных і іншых адносінах: “Алеевы” лабіст” – заметка пра спадара К., які лабіраваў інтарэсы фірмы, што выпускае алеі [Зв., 06.03.02]; “Апошнія “гастролі”– пра затрыманне злачынцаў з Гомеля супрацоўнікамі Гродненскай міліцыі (у крымінальных колах злачынцаў з іншых абласцей называюць гастралёрамі) [Зв., 23.02.02]; “Атручаны дом” – пра дом пенсіянеркі, у якім норма ртуці перавышана ў 150 разоў [Зв., 24.01.03]; “Брыльянтавая”фальшыўка”– пра гандляра, які збываў падробленыя чорныя брыльянты [Зв., 05.01.02]; “Гераінавы” тамбур”– заметка пра затрыманне вялікай партыі гераіну ў тамбуры цягніка “Масква – Калінінград” [Зв., 29.01.03]; “Залатая” гамяльчанка”– пра гамяльчанку, у якой канфіскавалі 236 залатых вырабаў [Зв., 22.01.03]; “Кордны” тупік”– праблемны артыкул пра аб’яднанне “Хімвалакно”, якое не можа збыць выпушчаны шынны корд [Зв., 23.03.02]; “Левае” паліва” – пра нелегальныя нафтапрадукты [Зв., 29.01.03]; “Няправільныя” сабакі” – даецца апісанне рэдкай пароды сабак [Зв., 02.02.02]; “Паркетная” спрэчка”– пра жыхароў Польшчы, якія не разлічыліся за пастаўлены з Беларусі тавар [Зв., 06.03.02]; “Пякельная” пара”– пра спякоту ў час жніва [Зв., 19.08.03]; “Хворыя” нататкі” – праблемны артыкул пра недахоп фінансавання ў медыцыне [Зв., 20.08.03]; “Элітны” здзек”– аб якасці бульбы ў магазіне [Зв., 12.04.03]. Загаловак “Мёртвыя душы” паўтарае вядомую назву мастацкага твора і таму бярэцца ў двукоссе. Змест артыкула падобны на сюжэт класічнага твора М.В. Гогаля з аднайменнай назвай [Зв., 23.03.02].

Некаторыя загалоўкі з якасна-адносным значэннем утвараюць устойлівыя фразеалагічныя адзінкі, што на працягу свайго існавання набылі адносную стандартызаванасць і універсальнасць. Такія загалоўкі на працягу свайго функцыянавання губляюць намінатыўную дакладнасць, выразнасць, здольнасць уздзейнічаць на чытача і ператвараюцца ў моўныя клішэ са сцёртай экспрэсіяй: “Любоўны трохвугольнік” [Зв., 05.07.01]; “Надзвычайнае становішча” [Зв., 27.06.01].

Невялікую групу простых развітых загалоўкаў утвараюць канструкцыі <u>назоўніка з прыналежным прыметнікам</u>, якія будуюцца на падставе прэпазіцыйнага залежнага кампанента і перадаюць азначальна-прыналежныя значэнні: “Барысавы камяні” – пра музей камянёў у Барысаве [НГ, 16.02.02]; “Дзядзькава навука” – заметка пра сямейныя традыцыі ў гарбарскай справе [Зв., 19.04.03]; “Еўклідавы паралелі” – нататкі аб жыццёвых праблемах простых людзей [П. – 2000. – № 9. – С. 139]; “Кошыкавы ганак”– фотарэпартаж пра майстра, які пляце кошыкі [Зв., 03.04.03]; “Матчына сэрца” – праблемны артыкул пра маці, якая адна выхоўвае сваіх дзяцей [Зв., 15.01.03]; “Саламонава рашэнне?” – афарыстычны загаловак, які абазначае мудрае рашэнне. У артыкуле ідзе гаворка пра кіраўніка гаспадаркі і яго метады работы [Зв., 12.03.03]. У публіцыстыцы яны сустракаюцца даволі рэдка, таму што патрабуюць ад аўтара дэталёвага раскрыцця асобы, прадмета або паняцця, якія ўзгадваюцца ў загалоўку.

Значная частка простых развітых загалоўкаў пабудавана па мадэлі <u>назоўнік у назоўным склоне + назоўнік ва ўскосным склоне</u>. Самая разнастайная па характары семантычных значэнняў група загалоўкаў, у якой галоўны кампанент кіруе родным склонам залежнага кампанента. У гэтай групе выдзяляюцца загалоўкі з наступнымі значэннямі:

а) суб’ектным: “Гібель Альбатроса” – пра беларускага лётчыка, які служыў у эскадрыллі “Русь” [Зв., 27.06.01]; “Лёс чалавека” [М. – 1996. – № 3. – С. 204]; “Кінаспадарожнік гледача”

МДПУ імя І.П. Шамякіна

[ЛіМ, 20.12.02]; “Маналог паэта” [НГ, 14.02.02]; “Плач вады” – метафарычны загаловак аб шкодзе меліярацыі [П. – 1993. – № 3. – С. 104]; “Саюз рыцараў” [НГ, 29.01.02]; “Свята сяброў” [НГ, 05.03.02]; “Скарачэнне штатаў” [Зв., 30.01.02]; “Спавядальнікі спавядальнікаў” [ЛіМ, 20. 12.02]; “Удзячнасць чытача” [ЛіМ, 01.11.02].

Асобную падгрупу складаюць загалоўкі, у якіх адным з кампанентаў з’яўляецца ўласны назоўнік або ўласныя назоўнікі: “Аднатомнік Алеся Гаруна” [Зв., 23.08.03]; “Даследчыкі Тараса Шаўчэнкі” – агляд жыцця і творчасці А. Ахрыменкі, які даследаваў творчасць Т. Шаўчэнкі [ЛіМ, 25.10.02]; “Дзённікі Іосіфа Голубева” [ЛіМ, 25.10.02]; “Імя Салярцінскага” [ЛіМ, 20.12.02]; “Карта Тамаша Макоўскага” [Зв., 21.08.03]; “Клуб Пятра Машэрава” [НГ, 29.01.02]; “Кніга Дубоўкі” [ЛіМ, 06.12.02]; “Свет Міхася Стральцова” [НГ, 21.02.02]; “Стыхія Ігара Засімовіча” [Зв., 01.03.02]; “Фокус Мюнхгаўзена” [Зв., 15.08.03];

б) аб’ектным: “Выганка зялёнкі” – заметка з парадамі садаводам наконт вырошчвання зяленіва кропу і пятрушкі [Зв., 16.01.02]; “Выстава выцінанкі” [ЛіМ, 18.10.02]; “Вяртанне праўды” [Зв., 10.09.03]; “Гісторыя палаца” [ЛіМ, 29.11.02]; “Дзень ліцэя” – заметка пра 10-годдзе Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Я. Коласа [НГ, 24.01.02]; “Наступствы скарачэнняў” [Зв., 27.03.02]; “Парад тэхналогій” [НГ, 21.02.02]; “Права язды” [Зв., 01.01.02]; “Ранак панядзелка” [Зв., 30.08.03]; “Расада цыбулі” [Зв., 13.02.02]; “Смак бульбы” [Зв., 19.01.02]; “Сітуацыя поспеху” [НГ, 12.03.02]; “Фарміраванне душы” [НГ, 09.02.02]; “Элементы самастойнасці” [НГ, 19.01.02]; “Юбілей газеты” [ЛіМ, 20.12.02]; “Юбілей школы” [НГ, 24.01.02];

в) азначальным: “Аблічча любові” [ЛіМ, 06.12.02]; “Абнаўленне духу” [ЛіМ, 25.10.02]; “Адбіткі вечнасці” [НГ, 02.02.02]; “Атмасфера дабра” [НГ, 26.02.02]; “Пачатак сяброўства” [НГ, 02.02.02]; “Прага любові” [Зв., 19.08.03]; “Слова развітання” [Зв., 22.01.03]; “Сухвецце бяды” [М. – 1996. – № 10. – С. 191];

г) азначальна-прыналежным: “Гаспадар “Сасновага бору” [ЛіМ, 16.08.02]; “Група рызыкі” [Зв., 18.03.03]; “Дзеці стагоддзя” [Зв., 01.01.01]; “Дзеці Эўтэрпы” – фотарэпартаж да 70-годдзя Беларускай акадэміі музыкі. Эўтэрпа або Еўропа – муза Старажытнай Грэцыі – апякунка музычных традыцый старасвецкай Еўропы [ЛіМ, 29.11.02]; “Золата арміі” – так М.Дзябёла ў сваім артыкуле называе лепшыя армейскія кадры [Зв., 24.01.02]; “Кароль” карняплодаў” – метафарычны загаловак заметкі пра цукровыя буракі [Зв., 21.02.02]; “Лісты часу” – назва выставы, прысвечанай 130-годдзю з дня нараджэння Вітольда Бялыніцкага-Бірулі [НГ, 14.03.02]; “Салдаты правапарадку” – пра будні міліцыянераў [Зв., 14.02.02]; “Свет Сям’і” – артыкул пра ток-шоу “Бацькі і дзеці”, якое прысвечана жыхарам інтэрнатаў горада Мінска [НГ, 05.03.02]; “Спякота Жэневы” [Зв., 30.08.03];

д) колькасным: загаловак “Мора цішыні” [ЛіМ, 25.10.02] мае колькаснае значэнне з адценнем меры.

Нязначную па прадуктыўнасці групу складаюць загалоўкі канструкцыі назоўнік + назоўнік, дапасаваны ў склоне. Такія канструкцыі перадаюць азначальныя адносіны. Парадак кампанентаў у іх адносна адвольны: “Аўтары-настаўнікі” [НГ, 23.03.02]; “Дзяўчынка-планета” [НГ, 05.02.02]; “Педагогі-лаўрэаты” [НГ, 26.03.02].

У загалоўках канструкцыі назоўнік + прыназоўнік + назоўнік у родным склоне важнае значэнне мае прыназоўнікавае кіраванне, а парадак слоў характарызуецца постпазіцыяй залежнага кампанента. Загалоўкі такой канструкцыі перадаюць азначальныя адносіны з рознымі адценнямі:

а) аб’ектным: “Прывітанне ад паліцыі” [Зв., 23.01.02]; “Эпілог да спрэчкі” [Зв., 13.03.02];

б) мэтавым: “Вудсток для мясцовых” [ЧЗ, 08.08.03]; “Прыстанак для рамантыкаў” [ЧЗ, 22.08.03]; “Цыганка для цыгана?” – праблемны артыкул пра сумяшчальнасць людзей па крыві [Зв., 02.03.02];

в) прасторавым: “Дыпламантка з Гомеля” [НГ, 26.03.02]; “Махляр з Нігерыі” [Зв., 12.08.03]; “Шлях да Святла” – метафарычны загаловак рэпартажу з выставы жывапісу А. Вацуры, які ўсё жыццё імкнуўся намаляваць Святло [Зв., 02.03.02].

Загалоўкі канструкцыі назоўнік + прыназоўнік + назоўнік у вінавальным склоне маюць прыназоўнікавае кіраванне. Залежны кампанент знаходзіцца ў постпазіцыі ў адносінах да галоўнага. Загалоўкі ўжываюцца з наступнымі значэннямі:

а) аб’ектным: “Альбом пра радзіму” [ЛіМ, 29.11.02]; “Інвестыцыі ў зямлю” [Зв., 19.02.02]; “Паляванне на дублёнкі” [Зв., 13.03.02] – метафарычны загаловак пра выпадкі крадзяжу дублёнак з мэтай далейшага перапродажу; “Права на крэдыт” [Зв., 13.03.02]; “Стаўка на выратаванне” [Зв., 19.01.02];

б) азначальна-акалічнасным: “Абразы на вываз” [Зв., 12.08.03]; “Крок у неба” [НГ, 28.03.02]; “Позірк за Буг” [Зв., 30.06.01].

Значная група простых развітых загалоўкаў прадстаўлена канструкцыяй назоўнік + прыназоўнік + назоўнік у месным склоне. Такім загалоўкам уласцівы наступныя значэнні:

а) аб’ектныя: “Аварыя на газаправодзе” [Зв., 06.02.02]; “Бураціна ў цэлафане” – заметка пра спектакль пад аднайменнай назвай [ЛіМ, 20.12.02]; “Выбух на дыскатэцы” [Зв., 26.06.01]; “Дзеці на дарозе” [Зв., 26.08.03]; “Замаразкі на глебе” [Зв., 06.09.03]; “Мама па кантракце” – назва праблемнага

МДПУ ім. І.П. Шамякіна

артыкула пра новую форму выхаваўчай работы, якая атрымала назву "Прыёмная сям'я" [НГ, 26.03.02]; "Мінулае ў постацях" [ЛіМ, 29.11.02]; "Навучанне на адлегласці" [НГ, 28.03.02]; "Прэс-канферэнцыя па кнізе" [ЛіМ, 20.12.02]; у загалоўку "Урок па СМІ" ў ролі залежнага кампанента ўжываецца нескланяльная абрэвіятура, 'сродкі масавай інфармацыі' [НГ, 26.03.02].У ролі залежнага кампанента гэтай канструкцыі можа ўжывацца перыфраза, што ўносіць дадатковую экспрэсіўную нагрузку ў загаловак: "Жанчыны на "жалезных конях" [Зв., 01.03.01] і "Свята на "жалезных конях" [Зв., 30.08.03]. Перыфраза "жалезныя коні" ўжываецца для пераноснага абазначэння назвы транспартных сродкаў. Пад першым загалоўкам змешчана інтэрв'ю з жанчынамі, якія працуюць вадзіцелямі таксі, другі – прадстаўляе заметку пра свята байкераў у Мінску;

б) азначальна-акалічнасныя: "Вечарына ў Маскве" [ЛіМ, 20.12.02]; "Вішня на Беларусі" [Зв., 21.03.02]; "Восень у Парыжы" [П. – 1993. – № 9. – С. 146]; "Выстаўка на радзіме" [ЛіМ, 29.11.02]; "Госці з Украіны" [ЛіМ, 06.12.02]; "Дажынкі ў Матырыне" [Зв., 27.08.03]; "Малянкоў у Беларусі" [Зв., 21.08.03]; "Наваселле на Садовай" [Зв., 12.02.02]; "Пенсіі ў ліпені" [Зв., 05.07.01]; "Свята ў Лелікаве" [Зв., 29.08.03]; "Сустрэча ў гімназіі" [ЛіМ, 06.12.02].

У мове газет выкарыстоўваюцца канструкцыі назоўнік + лічэбнік у назоўным склоне. Пропуск лішніх у інфарматыўных адносінах слоў дазваляе перадаць думку аўтара ў максімальна сціслай форме: "Вожыку – 60!"– інтэрв'ю з галоўным рэдактарам гумарыстычнага часопіса "Вожык" М. Пазняковым з нагоды юбілею выдання [Зв., 07.07.01]; "Доўнар-Запольскаму – 135" – агляд жыцця і творчасці славутага навукоўца [ЛіМ, 06.12.02]; "Рэйгану – 90" – заметка аб жыцці былога прэзідэнта Амерыкі, які дасягнуў 90-гадовага ўзросту [Зв., 08.02.01]. Дадзеныя канструкцыі нагадваюць па сваёй будове эліптычныя сказы, лаканічнасць якіх дасягаецца за кошт скарачэння дзеяслова 'споўнілася'.

Асобную падгрупу ўтвараюць загалоўкі, якія з'яўляюцца скарачэннем складаных словазлучэнняў: "Мальвы – 2002" (Мальвы дзве тысячы другога года або Мальвы ў дзве тысячы другім годзе) – назва традыцыйнага рэспубліканскага конкурсу эстраднай польскай песні [НГ, 25.06.02]; "Птушкі – 2002"– заметка з выставы птушак у Мінску [НГ, 29.01.02].

У канструкцыях назоўнік + парадкавы лічэбнік парадкавы лічэбнік займае прэпазіцыйнае становішча і дапасуецца да назоўніка ў родзе, склоне і ліку: "Першыя манты" [ЛіМ, 20.12.02].

У загалоўку "Дзве згадкі" [П. – 2002. – № 11. – С. 212] колькасны лічэбнік дапасуецца да назоўніка ў родзе і склоне і знаходзіцца ў прэпазіцыі адносна галоўнага кампанента канструкцыі.

Канструкцыі назоўнік + дзеепрыметнік залежнага стану будуюцца на падставе поўнага дапасавання дзеепрыметніка, які знаходзіцца ў прэпазіцыі да назоўніка. У загалоўках гэтай канструкцыі назіраецца некаторая двухпланавасць, якая праяўляецца ў наяўнасці прэдыкатыўнай і іменнай функцыі дзеяслоўных форм. Але прэдыкатыўнасць загалоўка праяўляецца толькі ў сувязі з тэкстам публікацыі, таму на першы план выходзіць намінатыўная функцыя. "Гарантаваны мінімум" [Зв., 27.08.03]; "Закратаванае сэрца"– метафарычны загаловак на кнігу вершаў А.Сыса "Сыс" [ЛіМ, 15.11.02]; "Затрыманы вымагальнік" [Зв., 21.03.02]; "Згубленыя ўрокі?!" [НГ, 16.05.02]; "Канфіскаваны метадон" [Зв., 15.03.02]; "Падпісаны мемарандум" [Зв., 22.01.03].

Невялікую групу складаюць загалоўкі, пабудаваныя на аснове спалучэння назоўніка і прыслоўя, дзе залежны кампанент прымыкае да галоўнага слова і знаходзіцца ў постпазіцыі да яго: "Вяртанне дамоў" [ЛіМ, 11.10.02]; "І тэхніка напагатове" [Зв., 05.08.03]; "Настальгія па-беларуску" [ЛіМ, 29.11.02]. Для іх уласцівы азначальныя адносіны.

У загалоўках назоўнік + абагульнена-якасны займеннік залежны кампанент дапасуецца да галоўнага і знаходзіцца ў прэпазіцыі. Такія канструкцыі паўтараюць структуру спалучэнняў назоўніка з дапасаваным прыметнікам: "Ваша здароўе" [Зв., 26.02.02]; "Наша расада" [Зв., 30.01.02]; "Нашы землякі" [П. – 2002. – № 1. – С. 216].

Такім чынам, просты развіты назоўнікавы загаловак складаецца, як правіла, з двух кампанентаў, звязаных падпарадкавальнымі адносінамі. Паміж кампанентамі канструкцыі існуюць розныя віды семантыка-сінтаксічных адносін: азначальныя, акалічнасныя, прыналежныя, суб'ектныя, аб'ектныя і інш.

Большасць простых развітых назоўнікавых загалоўкаў публіцыстычнага тэксту ўтворана па мадэлі назоўнік + прыметнік, назоўнік + назоўнік у родным склоне, назоўнік + прыназоўнік + назоўнік ва ўскосным склоне. Структурна-семантычныя ўласцівасці гэтых загалоўкаў даюць магчымасць шырока прымяняць іх ва ўсіх жанрах публіцыстыкі.

***Прынятыя скарачэнні***

Зв. – "Звязда"
ЛіМ – "Літаратура і мастацтва"
М. – "Маладосць"
НГ – "Настаўніцкая газета"
П. – "Полымя"
ЧЗ – "Чырвоная змена"

МДПУ им. И.П. Шамякина

**_Summary_**

In article "Forgiven developed noun a title in publication" is considered structured-semantic particularities of most typical models forgiven developed nouns of titles. The Particularities of titles are considered on actual material belorussian publication.

*Поступила в редакцию 03.11.03.*